# Прыставачны спосаб утварэння прыслоўяў

**Урок беларускай мовы ў VII класе**

**І. І. Каспяровіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
Сярэдняя школа №9 г. Пінска»

<u>**Мэты ўрока**</u>:

- спрыяць паглыбленню ведаў вучняў аб прыставачным спосабе ўтварэння прыслоўяў, дапамагчы ўсвядоміць, што такім спосабам прыслоўі утвараюцца толькі ад прыслоўяў, пазнаеміць з канкрэтнымі выпадкамі прыставачнага ўтварэння прыслоўяў;
- дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання не (ня), ні з прыслоўямі, працягваць знаемства з выяўленчымі магчымасцямі прыслоўяў у тэксце, вучыць выкарыстоўваць гэтыя магчымасці ва ўласным маўленні;
- выхоўваць культуру вуснага і пісьмовага маўлення.

<u>**Мэты на мове вучняў:**</u>

- засвоіць прыставачны спосаб утварэння прыслоўяў;
- ад якіх часцін мовы ўтвараюцца прыслоўі прыставачным спосабам;
- засвоіць як пішацца не (ня), ні з прыслоўямі;

<u>**НаштоБуЗу:**</u>

Уменне тлумачыць прыставачны спосаб утварэння прыслоўяў і правапіс не (ня), ні з прыслоўямі;

## Ход урока

<u>**I.Арганізацыйны момант.**</u>

**Настаўнік.** Калі прыслоўе адказвае на пытанне “як”? (Значыць, яно бярэ на сябе абавязак паказаць нам, як адбывалася дзеянне, спосаб дзеяння. Напрыклад: як можна спяваць? (ціха, гучна, задушэўна, весела). Запішыце ў сшытак як вы плануеце сення працаваць і адказваць на ўроку. Патрэбныя прыслоўі выберыце з пр.176, дапоўніце свае.

*Працаваць:* актыўна, старанна, упэўнена, хутка, добра.

*Адказваць:* гучна, выразна, прыгожа, правільна, цверда, канкрэтна.

Малайцы, ужо адну з задач да ўрока вы сабе паставілі.

<u>**II. Праверка дамашняга задання** (пр.203)</u>

**Настаўнік.** Прачытайце верш, выпішыце прыслоўі і зрабіце іх словаўтваральны разбор.

Непрыкметна – непрыкметны

Зноў – новы (бяссуф.)

Моўчкі – маўчаць

Пакрысе –крыху

Аднойчы – адно

Уночы – ноч

***Работа з класам “Адгадай загадку”***

1. Гэтым спосабам прыслоўі ўтвараюцца толькі ад прыслоўяў. *(Прыставачны.)* (вечна-навечна, летась-залетась).

2. Гэтым способам прыслоўі ўтвараюцца ад назоўнікаў, прыметнікаў,займеннікаў, лічэбнікаў. *(Прыставачна-суфіксальны.)*

3. Гэтым способам прыслоўі ўтвараюцца ад назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў. *(Суфіксальны.)*

Крыўдны-крыўдна, бегчы-бягом, ноч-ноччу.

**III. Паведамленне тэмы ўрока. Мэтавызначэнне. Работа над новым матэрыялам**.

- НаштоБуЗу:

а) як вы адказваеце;

б) як тлумачыце способ утварэння прыслоўя і правапіс не (ня), ні з прыслоўямі.

**Настаўнік**. Што вам вядома пра прыставачны способ? *(Утварае новыя словы.)*

- Як ўтварыліся прыслоўі недзе (дзе), ніколі (калі);

- Ці магу я сцвярджаць, што прыслоўі ўтвараюцца ад іншых прыслоўяў прыставачным способам?

- Практыкаванне. 204

Прачнуцца засветла, зайсці ненадоўга,залішне хвалявацца, пазаўчора адбылося,з’явіўся ніадкуль, стаялі паабапал, наводдаль узвышаўся, нязграбна выглядаў, недзе ўгары, адпачываў пазалетась, заполініў назаўседы, бадзяўся абы дзе, некалі сустрэў, замала грошай, размешчана занізка.

- Які вывад зрабілі?

- Практыкаванне. 204

Выпісаць па 1 сказу, дзе есць прыслоўе, утворанае прыставачным способам, падкрэсліць як член сказа.

**IV. Падрыхтоўка да ўспрымання тэмы**

Тэма “Правапіс не (ня), ні з прыслоўямі”.

**Настаўнік.** Які наступны этап урока? Што даведаемся? *(Як пішацца не (ня), ні з прыслоўямі).*

- Пазнаёмцесь з апорным канспектам, п.26. і назавіце асноўныя палажэнні напісання не (ня), ні разам і асобна, якія паўтараюцца ў прыметніка і назоўніка. Прывядзіце прыклады.

- Практыкаванне 207 (работа ў парах).

Кожная пара працуе з адным са сказаў.

- Практыкаванне 208 (ля дошкі)

Выпісаць прыслоўе, якія без не (ня), ні не ўжываюцца.

Вывад: каб правільна напісаць не (ня), ні з прыслоўямі трэба скласці **алгарытм**.

1. Вызначыць, якая часціна мовы.
2. Ці ўжываецца гэтае слова без не.
3. Ці можна падабраць сінонімы.

**V. Рэфлексія**

1. Чым папоўніліся вашы веды ў пытаннях словаўтварэння?
2. Што было для вас легкім? Што здалося цяжкім?
3. Што спадабалася на ўроку больш?

Пастаўце + у адпаведных месцах схемы:

| | |
|---|---|
| Мая праца | Праца настаўніка |
| Форма ўрока | Змест ўрока |

4. Падлічыце колькасць атрыманых вамі балаў і ацаніце сваю працу на ўроку.